Спорт-тайм

# Чэмпіёнскія амбіцыі

У традыцыйным штотыднёвым аглядзе «Звязды» расказваем цікавыя спартыўныя навіны

**1. Баскетбольны клуб «Гарызонт» — уладальнік жаночага Кубка Беларусі.** Сярэбраныя медалі заваявалі дэбютанткі турніру «Цмокі-БДУ». Перамога «Гарызонта» была грандыёзнай, матч за першае месца скончыўся з вынікам 87:43. Але трэнер «Цмокі-БДУ» Вольга Падабед засталася імі задаволена: «Ганаруся сваімі падапечнымі. Яны паказалі добры баскетбол супраць такога моцнага саперніка, як «Гарызонт». Лічу, што выступілі на Кубку больш чым дастойна. Зараз пастараемся працягваць у тым жа духу ў чэмпіянаце краіны».




Бронзавым прызёрам Кубка стала каманда «Алімпія», якая з вынікам 76:72 абыграла «Цмокаў». Упершыню «Цмокі» засталіся без узнагарод Кубка Беларусі. Не дапамагла нават высокая выніковасць Брытні Джонс, якая набрала 31 бал. Сярод гульцоў «Алімпіі» лепшай стала Яна Галякова, якая набрала 22 балы і правяла дзевяць падбораў і дзве перадачы.

**2. Хакейны клуб «Мінск» выйграў Суперкубак Беларусі па хакеі на траве сярод мужчынскіх камандаў.** З вынікам 2:1 мінчане абыгралі сваіх прынцыповых апанентаў — брэсцкі клуб «Будаўнік».



Сярод жаночых каманд гэты трафей заваявалі спартсменкі з Гродзенскага «Рытму», якія аказаліся мацнейшым за «Мінск». Вынік сустрэчы — 2:2 па булітах. Суперкубкам Беларусі пачаўся новы сезон у хакеі на траве. Зараз беларускія каманды выступаюць у першым туры чэмпіянату Беларусі.

**3.** У «Стайках» прайшоў чэмпіянат Беларусі па цяжкай атлетыцы. Сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы 2019 Пётр Асаёнак стаў пераможцам у вагавай катэгорыі 96 кг. У суме двухбор'я знакаміты спартсмен пакарыў вагу ў 390 кг. Чэмпіён Еўропы – 2015 Аляксандр Венскель пакарыў у суме двухбор'я 375 кілаграмаў і стаў лепшым у катэгорыі 109 кілаграмаў. Эдуард Зязюлін стаў трохкратным чэмпіёнам Беларусі ў катэгорыі звыш 109 кілаграмаў, у двухбор'і ён пакарыў 410 кілаграмаў.

Сярэбраная медалістка Алімпійскіх гульняў – 2016 Дар'я Навумава стала чэмпіёнкай Беларусі ў катэгорыі 76 кілаграмаў. Тытуляваней спартсменкі пакарылася вага 228 кілаграмаў. У катэгорыях 59 кг і 64 кг першае месца заваявалі Дар'я Пачабут і Аліна Шчапанцава адпаведна. У катэгорыі 71 кг найлепшай стала Рына Літошык. Сярод спартсменак, чый вес 87 кілаграмаў, перамагла Іна Захарчук.

З-за таго, што ўсе міжнародныя турніры былі адменены праз пандэмію каранавіруса, чэмпіянат Беларусі стаў для беларускіх спартсменаў ключавым у сезоне.

**4. Вікторыя Азаранка не змагла прабіцца ў паўфінал турніру Internazionali BNL d'Italia, які праходзіў у Рыме.** 14-я ракетка свету ўступіла іспанскай тэнісістцы Гарбіньэ Мугурусе (17-е месца рэйтынга) з вынікам 6:3, 3:6, 6:4. Дагэтуль беларуская спартсменка перамагла амерыканку Вінус Уільямс (7:6, 6:2) і пятую ракетку планеты Софію Кенін — 6:0, 6:0. Усе аматары тэніса надоўга запомняць матч Вікторыі з расійскай спартсменкай Дар'яй Касаткінай. Напачатку матча Вікторыя вяла 3:1, але затым саперніца выйшла наперад 4:3. На тай-брэйку Дар'я няўдала ўпала і траўміравала нагу. Вікторыя Азаранка была першай, хто дапамог расійскай спартсменцы: прынесла лёд, абцерла ручніком, давяла да лаўкі і на развітанне клапатліва пацалавала ў лоб.

Беларускія тэнісісткі адзначыліся і на іншым міжнародным турніры — Magic Tours (W15 Monastir), які праходзіў у Тунісе. Беларуская тэнісістка Шалімар Тальбі перамагла ў адзіночным разрадзе. У фінальным матчы яна абыграла беларуску Ганну Кубараву з вынікам 2:6, 7:5, 6:4. Яшчэ адна беларуска Юлія Гатоўка дайшла да паўфінальнай стадыі турніру, дзе прайграла суайчынніцы Ганне Кубаравай з вынікам 3:6, 5:7. Дуэт Ганны і Юліі стаў лепшым у парным разрадзе. Беларускія тэнісісткі перамаглі сясцёр Ліан і Дэмі Тран з Нідэрландаў — 7:6, 0:6, 10:2.

**5. Беларуская зборная па футболе засталася на 87-м месцы ў абноўленым рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі футбола (ФІФА).** За апошнія два месяцы беларуская футбалісты правялі два стартавыя матчы ў групавым этапе новага сезона Лігі нацый УЕФА. Спачатку яны прайгралі камандзе Албаніі, якая займае 66-е месца ў рэйтынгу ФІФА, з вынікам 0:2. Але затым перамаглі зборную Казахстана (118-я пазіцыя ў рэйтынгу) з вынікам 2:1. Зараз у актыве беларускай каманды 1282 балы.

Наступны матч беларусы правядуць у Тбілісі супраць зборнай Грузіі (89-е месца рэйтынга ФІФА). Гэта будзе паўфінал стадыі плэй-оф за выхад у фінал чэмпіянату Еўропы. На групавым этапе Лігі нацый беларускія футбалісты сустрэнуцца з камандай Літвы 11 кастрычніка. Матч пройдзе ў Вільнюсе. А 14 кастрычніка ў Мінску адбудзецца матч з казахстанскай камандай.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.56 | 19.07 | 12.11 |
| Віцебск — | 6.45 | 18.57 | 12.12 |
| Магілёў — | 6.46 | 18.58 | 12.12 |
| Гомель — | 6.42 | 18.54 | 12.12 |
| Гродна — | 7.11 | 19.23 | 12.12 |
| Брэст — | 7.12 | 19.23 | 12.11 |

### Месяц

*Маладзік 17 верасня. Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

*Пр. Ганны, Аляксея, Васіля, Захара, Іосіфа, Мікіты, Рыгора, Сяргея, Феафана, Фядоса, Харытона, Якіма.*
*К. Маўрыцыя, Тамаша.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**— Ігнат, замаўчы!**
**— Дык я ўжо з самай раніцы маўчу...**
**— Але ты думаеш пра тое, што мяне вельмі злуе!**

— Аркаша, сыночак! Вазьмі на вуліцу ліхтарык!
— Навошта? Там светла!
— Пасля будзе цёмна! Ты што, хочаш быць, як твой брат?
— А што брат?
— Ды ён таксама не хацеў браць ліхтарык... І ты бачыў, каго ён нам прывёў?

**— Можа, адмовімся ад хатняга тэлефона? Мы ім амаль не карыстаемся!**
**— Гэта ты не карыстаешся! Ты цэлы дзень на працы. А я тэлефаную з хатняга на свой мабільны, каб даведацца, дзе ён ляжыць!**



Даты | Падзеі | Людзі

### 22 ВЕРАСНЯ

У краіне

**1860** год — нарадзіўся Сямён Маркавіч Дубноў, яўрэйскі гісторык, публіцыст, грамадскі дзеяч. Адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў яўрэйскага гісторыка-этнаграфічнага таварыства. Аўтар даследаванняў па гісторыі яўрэяў у свеце, у Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Сабраў і апублікаваў шмат дакументаў, пераважна па гісторыі беларускіх яўрэяў. Забіты фашыстамі ў рыжскім гета ў 1941-м.



**1925** год — нарадзіўся Аляксандр Пятровіч Траяноўскі, беларускі перакладчык, крытык, публіцыст. Працаваў у газеце «Звязда», быў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Мастацтва Беларусі». Пераклаў з украінскай на беларускую мову вершы Івана Франко, Паўла Тычыны і іншых. Аўтар, перакладчык і ўкладальнік кашубскай анталогіі. Укладальнік анталогіі беларускага апавядання «Дзівак з Ганчарнай вуліцы».

**1940** год — нарадзіўся Дзмітрый Георгіевіч Багушэвіч, беларускі мовазнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар. Адзін з заснавальнікаў Беларускай асацыяцыі камунікатыўнай лінгвістыкі.

**2005** год — Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ «Аб Парку высокіх тэхналогій».

У свеце

**1875** год — нарадзіўся Мікалоюс Канстанцінас Чурлёніс, літоўскі кампазітар, паэт, мастак. Аўтар першых літоўскіх сімфанічных паэм, камерна-інструментальных твораў. Аўтар жывапісных цыклаў «Саната сонца», «Саната вясны» і іншага.

**1900** год — нарадзіўся Сяргей Іванавіч Ожэгаў, расійскі мовазнавец, лексікограф, доктар філалагічных навук.



**1925** год — нарадзіўся Вячаслаў Уладзіміравіч Броўкін, расійскі рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР. Працаваў у беларускіх тэатрах імя Коласа і Купалы.

**1935** год — пастановай ЦВК і СНК СССР ва Узброеных Сілах СССР уведзена вайсковае званне Маршал Савецкага Саюза. 2 верасня 1940-га ўказам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР заснаваны асаблівы знак — «маршальская зорка».

У гэты ж дзень нарадзіўся Ювеналій (у свеце — Уладзімір Кірылавіч Паяркоў), мітрапаліт Круціцкі і Каломенскі, кіраўнік Маскоўскай епархіі, пастаянны член Свяшчэннага Сінода Рускай праваслаўнай царквы.

Так гаварыў...

**Іван КРЫЛОЎ:**
*«Каго нам хваліць вораг, у тым, пэўна, толку ні на грош».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2850.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 21 верасня 2020 года.